**РУП «Институт недвижимости и оценки« (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Дабрабыт« (Продавец) проводит повторный открытый аукцион**

**по продаже амбулатории (инв. №621/С-47455) площадью 157,2 м²**
**и гаража (инв. 621/С-47456) площадью 52,7 м²,**
**расположенных по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, Ланский с/с, аг. Лань, ул. Советская, 75А.**

Земельный участок площадью 0,1093 га с кадастровым номером 624282003601000315. Целевое назначение – обслуживание здания амбулатории. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 131 051 520 бел. руб.**
**Задаток – 13 105 152 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк« ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки«, УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Дабрабыт«,* **проводимом 24 сентября 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пять процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **24.09.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 22.09.2015 до 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда« от 11.04.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация:**
**8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Свидетельство о регистрации №100053112 и ПЕЧАТЬ на ЧТУП «БЕЛЭНЕРГОПРОКАТ« **считать недействительными в связи с утерей.**

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА № 0643824; по обязательному страхованию ГО владельцев ТС на территории РБ серии ВР № 5427837; квитанцию о приеме денежных средств формы 1СУ серии КС № 3621719, № 4147739 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест« **считать недействительными в связи с утерей.**

**Гродненский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки«**

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ
в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Филиала «ГАП № 2 г. Гродно«, назначенного на 24.09.2015 г. следующего содержания: Лот № 1 имеет обременения со стороны 3-х лиц: капитальное строение, инв. № 400/С-60256, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 13, площадью 656,8 кв.м сроком до 31.01.2018 г. УНП 500836025

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

**УП «Минский городской центр недвижимости« сообщает о внесении следующих изменений в графу 7 таблицы извещения о проведении 23 сентября 2015 года открытого аукциона с условиями № 11-У-15 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) (опубликовано в газете «Звязда« от 19.08.2015):**
- цифры «111 961 914« заменяются цифрами «131 892 835«;
- цифры «98 250 264« заменяются цифрами «118 181 185«;
- цифры «124 183 400« заменяются цифрами «144 114 321«;
- цифры «38 237 610« заменяются цифрами «83 124 166«.

**Телефон для справок 226-16-72.**


## Імгненні Вялікай вайны

# ГРОДНА 100 ГАДОЎ ТАМУ



Узарваны форт гродзенскай крэпасці 1915 г.


Чыгуначны вакзал 03.09.1915 г.


Узарваны мост праз Нёман 02.09.1915 г.



Умацаванне гродзенскай крэпасці 1915 г.


Артылерыйская гармата падарвана пры адыходзе войскаў 1915 г.


Казармы пасля бою 1915 г.

**Напярэдадні Першай сусветнай вайны гродзенская крэпасць уяўляла з сябе сістэму абарончых збудаванняў з трынаццаці фартоў і дваццаці чатырох апорных пунктаў, якія размяшчаліся вакол горада.**

З набліжэннем фронту і няўдалай абароны крэпасцей Нова-Георгіеўск і Асавец камандаваннем рускай арміі было прынята рашэнне аб знішчэнні фартыфікацыйных збудаванняў на левым беразе Нёмана ў выпадку немагчымасці іх далейшай абароны. Баі за крэпасць пачаліся ў канцы жніўня. Кайзераўскія войскі наступалі з захаду і паўднёвага захаду ў раёне I-V фартоў. Асноўныя баі разгарнуліся за III і IV фарты. Паколькі большая частка прыгоннай артылерыі была эвакуявана, рускія, мужна змагаючыся, ужо не маглі трымаць доўгую абарону. Да 1 верасня становішча стала крытычным. Немцы пасля жорсткіх атак авалодалі IV фортам. У сувязі з гэтым рускае камандаванне прыняло рашэнне аб падрыве ўсіх левабярэжных абарончых збудаванняў і адыходзе войскаў на правы бераг Нёмана для абароны горада. У ноч на 2 верасня 1915 года былі падарваны ўсе масты цераз раку. Але ўжо раніцай таго ж дня нямецкія войскі з'явіліся на левым беразе Нёмана, насупраць цэнтра горада, і пачалі наводзіць пантонныя масты для пераправы. Гэтае нечаканае наступленне заспела абаронцаў горада знянацку, завязаўся бой. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне, немцам удалося хутка пераправіцца на правы бераг і выцiснуць рускіх з горада. Пад пагрозай акружэння апынуліся XII і XIII фарты. Каб не дапусціць гэтага і даць магчымасць для адыходу часцей, якія трапілі ў цяжкае становішча, рускім камандаваннем было прынята рашэнне аб контратацы. Раніцай 3 верасня з паўночнага і ўсходняга боку пачаўся штурм горада. Асноўныя баі разгарнуліся ў раёне вакзала, але да гэтага часу галоўныя сілы немцаў ужо паспелі пераправіцца цераз Нёман і, нягледзячы на страты, здолелі ўтрымаць горад.

Але, дзякуючы гэтай атацы, рускія паспелі падарваць правабярэжныя фарты і пачаць адход на новыя пазіцыі.

**Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.**
**Паштоўкі з калекцыі аўтара**

# КНІГА ЯК ШЛЯХ ДА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

**Учора адкрылася XXVIII Маскоўская міжнародная кніжная выстава-кірмаш, якая на пачатку верасня ў расійскай сталіцы стала традыцыйнай. Яна будзе працаваць у Маскве з 2 па 6 верасня. Спецыяльныя экспазіцыі сведчаць аб шырокім тэматычным дыяпазоне прадстаўленых кніжных навінак. Асобна выдзелены праграмы краін — гасцей выставы («Арменія», «Іран», «Сербія», «Расія літаратурная»). Вылучаецца і дзіцячая праграма. Асаблівая ўвага нададзена праграме «Асвета і адукацыя». Вельмі шмат навінак, якія характарызуюць высокі паліграфічны ўзровень друкарняў і выдавецтваў Расіі і іншых краін СНД.**

Беларускі стэнд на выставе даволі прадстаўнічы, у экспазіцыі ўдзельнічаюць вядучыя выдавецтвы нашай краіны — «Беларусь», «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Выдавецкі дом «Звязда», «Пачатковая школа». Безумоўна, асаблівы адбітак на прэзентацыю кніжных навінак беларускіх выдавецтваў накладвае 70-годдзе Вялікай Перамогі. «Мастацкая літаратура» прадставіла нядаўна выдадзеную сумесную кнігу беларускага і расійскага аўтараў Алеся Адамовіча і Данііла Граніна «Блакадная кніга», якая ўжо добра вядома чытачу. Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прапанавала цэлы спектр кніг ваеннага гісторыка Барыса Далгатовіча.

Выдавецкі дом «Звязда» прадставіў альбом «Мая вайна» Васіля Ракашава, франтавога фотакарэспандэнта газеты «Красноармейская правда» (так у час Вялікай Айчыннай называлася «Беларусская военная газета», якую выпускалі на Заходнім, а пасля — на 3-м Беларускім фронце).

Несумненна, пагарталі гэтую кнігу, якая яскрава адлюстроўвае ўвесь трагізм, увесь драматычны характар Вялікай Айчыннай вайны, і расійскія наведвальнікі выставы-кірмашу, і тыя, хто прыехаў на кніжны форум з іншых краін. У гэтым альбоме ёсць і здымкі франтавога карэспандэнта маёра, а пасля падпалкоўніка Аляксандра Твардоўскага, які ў «Красноармейской правде» надрукаваў паэму «Василий Тёркин». Зацікаўленасць чытачоў выклічуць і кнігі сучасных беларускіх аўтараў. На выставе прадстаўлены серыя «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» і мастацкія творы аўтараў іншых краін, перакладзеныя на беларускую мову самымі вядомымі айчыннымі паэтамі і празаікамі.

Асобна выдзяляецца цэлая падборка кніг серый «Созвучие» и «Созвучие сердец» (гэта літаратурна-мастацкія праекты, якія паказваюць аўтараў Расіі і Беларусі), а таксама палітра кніг, што прадстаўляюць кітайскую літаратуру на беларускай мове. Сярод іх — серыя арыгінальных паэтычных зборнікаў «Светлыя знакі: паэты Кітая», выдадзеная ў Выдавецкім доме «Звязда». Тут прадстаўлены класікі кітайскай паэзіі Ван Вэй, Ду Фу, Лі Бо, Ай Цін. Гэтая серыя зацікавіла ўдзельнікаў выставы з Кітая, і можна спадзявацца, што нашы выдаўцы прывязуць з Масквы новыя прапановы, заключаць новыя пагадненні па аўтарскіх правах на прадстаўленне кітайскай паэзіі, найперш — сучасных аўтараў у Беларусі.

Шмат на беларускім стэндзе дзіцячых кніг, прадстаўлена нямала адукацыйных праектаў, асабліва ў гэтым плане вылучаюцца выдавецтвы «Народная асвета» і «Вышэйшая школа».

У дзень адкрыцця Маскоўскай міжнароднай выставы-кірмашу ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшоў «круглы стол» «Беларусь — Расія: агульны погляд у будучыню».

Адкрываючы яго, міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч падкрэсліла асаблівы характар беларуска-расійскага адзінства, заклікала зазірнуць не толькі ў мінулае, але і ў сучаснасць і падумаць пра будучыню нашых сумесных інтэграцыйных праектаў у сферы міжнацыянальнага супрацоўніцтва. Агульная культурная прастора — крокі да разумення адно аднаго. І каб гэтыя крокі былі істотнымі, варта пастаянна думаць аб канкрэтных перспектывах яе фарміравання, думаць пра тое, як будзе выглядаць інфармацыйнае грамадства XXI стагоддзя і якое культурнае багацце нашых народаў мы пакінем нашчадкам.

Маскоўская міжнародная выстава-кірмаш — традыцыйнае месца сустрэчы пісьменнікаў з розных краін. Асабліва шмат кантактаў з пісьменнікамі краін СНД ля беларускага стэнда. Цікавасць да беларускай кнігі праяўляюць і госці з Азербайджана на чале з вядомым паэтам Чынгізам Алі аглу, і госці з Арменіі на чале са старшынёй нацыянальнага саюза пісьменнікаў Арменіі Эдвардам Мілітанянам, і іншыя.

А калі ёсць такі інтарэс, будуць і новыя кнігі, і новыя сумесныя творчыя праекты, якія сведчаць аб дружбе і ўзаемаразуменні.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
*Масква — Мінск.*